# Прафесар Ігар Жук
# (13.06.1957–30.06.2017)

30 чэрвеня 2017 года памёр Ігар Жук, прафесар Кафедры беларускай філалогіі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. 2 ліпеня на могілках у вёсцы Гожа, што на беразе Нёмана пад Гроднам, развіталіся з чалавекам, які амаль сорак гадоў сумленна служыў беларускаму літаратуразнаўству.

Ігар Жук нарадзіўся 13 чэрвеня 1957 года ў вёсцы Зані на Мядзельшчыне ў сям'і настаўнікаў. Пасля заканчэння Будслаўскай сярэдняй школы вучыўся на філалагічным факультэце БДУ (1974–1979), а затым ў аспірантуры пры кафедры беларускае літаратуры (1979–1982).

У 1982 года пачаў свой працоўны шлях як асістэнт на Кафедры беларускай літаратуры Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. У 1986 годзе абараніў кандыдацкую дысертацыю *Гражданственность молодой белорусской прозы (70–ые годы)*, выкананую пад кіраўніцтвам Дзмітрыя Бугаёва.

У часы беларусізацыі пачатку 1990-х гадоў Ігар Жук спрычыніўся да ўтварэння ў ГДУ імя Янкі Купалы факультэта беларускай філалогіі і культуры ды быў яго першым дэканам (1991–1996). Навуковае званне дацэнта атрымаў ажно праз чатырнаццаць гадоў пасля абароны кандыдацкай дысертацыі (2000).

Новым словам у беларускай навуцы была падрыхтаваная і абароненая ў 2004 г. у Савеце па абароне дысертацый пры Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы НАН Беларусі доктарская дысертацыя Ігара Жука *Празаічны тэкст: дынаміка рытмавага існавання: На матэрыялах беларускай літаратуры*.

З 1991 года быў сябрам Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Першая публікацыя Ігара Жука ўбачыла свет у той час, калі ён быў студэнтам (1976). Гэта была рэцэнзія на кнігу ўспамінаў пра Янку Купалу *Такі ён быў*. У жанры рэцэнзіі ён будзе актыўна "працаваць" пад час напісання свае першае дысертацыі. Праўда, не толькі творчасць маладых беларускіх празаікаў, што адпавядала абранай тэме дысертацыі, будзе ў полі яго зроку. Апрача кніг Васіля Гігевіча, Леаніда Калодзежнага, Генрыха Далідовіча, Міхася Тычыны, Германа Кірылава, Віктара Казько і інш., Ігар Жук удумліва прааналізуе паэзію Янкі Сіпакова, прозу земляка-гарадзенца Аляксея Карпюка.

Першая кніга Ігара Жука – *Сустрэчны рух: Літаратуразнаўчыя эцюды* – выйшла з друку ў 1998 годзе ў Гродне. Невялікая па аб'ёму, яна

ўтрымлівае шэраг арыгінальных назіранняў, якія датычаць беларускага літаратурнага працэсу. Аўтар прапануе новае прачытанне і асэнсаванне творчасці беларускіх пісьменнікаў: Уладзіслава Чаржынскага, Кузьмы Чорнага, Янкі Купалы.

З сярэдзіны 1990-х гадоў Ігар Жук пачынае даследаваць рытмамелодыку К. Чорнага, рытмастылістыку прозы Якуба Коласа, рытмавыя ўласцівасці прозы Максіма Гарэцкага. Фактычна ўпершыню ў беларускім літаратуразнаўстве ім будзе "апісаны механізм атрымання з дапамогай камп'ютарнай апрацоўкі тэксту метрычных аўтарскіх эталонаў і разгледжаная сістэма іх дынамічнага ўзаемадзеяння". У метрычных аўтарскіх эталонах Ігар Жук выявіць "рытмічны інстынкт", што дазволіць яму па-новаму прааналізаваць асаблівасці мастацкага стылю майстроў беларускай прозы – Янкі Брыля, Васіля Быкава, М. Гарэцкага, Івана Мележа, К. Чорнага.

Выдадзеная ў 2003 г. манаграфія *Празаічны тэкст: дынаміка рытмавага існавання* дазволіла адназначна сцвердзіць: у беларускай навуцы з'явіўся сур'ёзны даследчык у галіне тэарэтычнага літаратуразнаўства, які плённа выкарыстаў напрацоўкі расійскае фармальнае школы першае трэці XX стагоддзя, а таксама заходнееўрапейскага стуктуралізму. Зыходзячы з ідэі, што ў нацыянальнай мове ёсць усё, каб даць празаічнаму выказванню рытм, Ігар Жук, даследуе беларускую прасодыю, унутраную структуру мовы, каб апісаць такую мастацкую з'яву, як празаічны рытм, для якой характэрныя асаблівыя метрычныя правілы: метрыку невершаванага мастацкага выказвання здольныя ўтвараць складаныя комплексы коланавых спалучэнняў. Гэтыя комплексы Ігар Жук называе пазнавальным аўтарскім эталонам, у аснове якога – жорстка фіксаваны, амаль нязменны архетып рытмавага вобраза тэксту. І хоць рытм празаічнаму выказванню пісьменнікам не надаецца свядома, бо рытм – гэта натуральная ўласцівасць мастацкай прозы. Але пісьменнік будуе фразу такім чынам, што па яе рытмавым малюнку можна яго пазнаць ці адрозніць ад іншага аўтара.

Шмат увагі Ігар Жук надаваў навучальнаму працэсу – падрыхтаваў і выдаў навучальна-метадычныя дапаможнікі *Беларуская крытыка і літаратуразнаўства: 20–30-я гг.* (Гродна 1997), *Беларуская літаратуразнаўчая школа: 20-я гг.* (Гродна 1999). Клапаціўся таксама пра ўзгадаванне новага пакалення беларускіх літаратуразнаўцаў.

З асаблівай любоўю і чуйнасцю Ігар Жук звяртаўся да вывучэння беларускай класічнай спадчыны. У той час, калі ў друку раз-пораз з'яўляліся абразлівыя публікацыі нібыта "постмадэрністаў", а таксама прадстаўнікоў сумежных гуманітарных навук пра пачынальнікаў сучаснай беларускай літаратуры, гарадзенскі даследчык з уласцівай яму лаканічнасцю і грунтоўнасцю паказваў на незразумелыя папярэднікамі і новымі "крытыкамі" аспекты творчасці класікаў, механізмы "этнічнай самаідэнтыфікацыі" ў іх тэкстах.

Творчасць Янкі Купалы і Якуба Коласа, якая ад самага пачатку прыцягвала ўвагу Ігара Жука, сталася для навукоўца аб’ектам павышанай увагі ў апошнія гады яго жыцця, калі рыхтаваў манаграфію *Прыхінуцца да крыніцы* (Гродна 2017), што выйшла з друку праз некалькі месяцаў пасля ягонае заўчаснае смерці, дзякуючы рупнасці Надзеі Чукічовай, вучаніцы і паслядоўніцы даследчыка. Дадзеная кніга, як адзначае Іван Штэйнер, – гэта не хваласпеў да чарговага юбілею песняроў, гэта новае прачытанне спадчыны класікаў паводле ўласнае методыкі даследавання. Характэрна, што навуковец звязвае тэматыку твораў класікаў з іх рытмікай.

Нечаканая смерць прафесара Ігара Жука – вялікая страта для нашага часопіса “Acta Albaruthenica”, сябрам рэдкалегіі якога ён быў, для беларускага літаратуразнаўства, для ўсяе беларусістыкі.

**Redakcja czasopisma „Acta Albaruthenica”**